**Палулех, З.** Не забыць цябе, Афганістан / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 1988. — 29 кастр. — С. 2.

**НЕ ЗАБЫЦЬ ЦЯБЕ, АФГАНІСТАН**

Памяць усё часцей і часцей вяртае яго ў той час, у якім змясціліся доўгія і адначасова такія кароткія два гады службы ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан. Што такое шчырасць, мужнасць, дружба, баявое братэрства, наўрад ці змог бы ён адчуць да канца, калі б не давялося яму дзяліцца з таварышам апошнім глытком вады з флягі, крочыць пад напаленым сонцам, якое так награвае зямлю, што ступням ног горача нават праз падэшвы ботаў.

...І ў той памятны дзень тэмпература была каля 50 градусаў. А якая амуніцыя ў салдата – вядома: аўтамат, патроны, пудовы бронежилет, боты. Разведчикі ахоўвалі ад нападзення калону «Уралаў» з  дызельным палівам. Як і звычайна, на пярэдняй бронемашыне ехаў камандзір узвода. І тут – выбух. Нейкім цудам усё абыйшлося, пашкодзіла толькі машыну. Камандзір хуценька перасеў на другую – і зноў наперад.

Праз сто метраў – новы шквал агню, выбух і, град асколкаў. І аднекуль з вышыні пачалі стральбу душманы. Зразумелі: засада.

Камандзіра цяжка параніла. І тады ён, Леанід Мікшта, як намеснік камандзіра ўзвода, прыняў камандаванне падраздзяленнем на сябе.

Па яго камандзе разведчыкі, пакуль асноўныя сілы адстрэльваліся, адыйшлі назад, і, падняўшыся амаль што па вертыкальных скалах наверх, адкрылі адтуль агонь па душманах.

Працягваўся той бой каля дзвюх гадзін. За прыняцце правільнага аператыўнага рашэння Леанід Мікшта быў узнагароджан медалём «За баявыя заслугі».

...Нялёгка давялося тым, хто выконваў свой інтэрнацыянлльны абавязак у Афганістане. А ён, Леанід Мікшта, служыў там у 1981–1983 гадах, самых першых, а значыць, і самых цяжкіх.

А трапіў ён на пярэдні край барацьбы з душманамі, у разведвальна-дэсантную роту. Пабываць яму давялося на тэрыторыі амаль усяго Аф-ганістана. Разведчыкі прымалі ўдзел у самых розных аперацыях. І пастаянна – у напружанні, у баявой гатоўнасці. У любы момант можна было пачуць над сабой свіст куль. Небяспека падсцерагала на кожным крону.

– Аднойчы, – успамінае Леанід, – баявая разведвальна-дэсантная машына, дзе я быў механікам-вадзіцелем, падарвалася на міне. Выбух прыйшоўся на заднюю частку машыны. А мяне крыху параніла. Гэтае «крыху» абярнулася двума месяцамі знаходжання ў шпіталі. А потым зноў у разведку.

Ці мог ён падумаць, што яму, вясковаму хлопцу, які ў дзяцінстве проста гуляў у вайну, давядзецца глядзець ёй прама ў вочы пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

Вайна перакройвае людзей.

З вялікай павагай я адношуся да тых юнакоў, якім давялося несці во-інскую службу там, у Афганістане. На нашых «афганцаў» я гляджу як на лепшую частку моладзі, якая пазнала сапраўдныя каштоўнасці на мяжы паміж жыццём і смерцю.

Гэтыя юнакі – нашы равеснікі. Равеснікі тых, хто цяпер цешыцца мала-досцю ў дыскатэках, хто трызніць рокам, хто іншы раз адсутнасць «ва-роных» джынсаў расцэньвае як ледзь не самую вялікую трагедыю. Воіны-інтэрнацыяналісты вышэй іх... На жаль, не ўсе з нас яшчэ разумеюць,

праз якія выпрабаванні прайшлі гэтыя зусім юныя хлопцы, як надломлена часам іх псіхіка, як востра ўспрымаюць яны раўнадушша, чэрствасць, а то і проста абыякавасць да іх лёсаў.

Зусім нядаўна Леанід вярнуўся з Бабруйска, дзе праходзіў рэспублі-канскі злёт ваенна-патрыятычных аб'яднанняў, клубаў воінаў запасу. Вярнуўся ўзрушаны, уражаны ўсім убачаным і пачутым. Кожны ўдзельнік збору мог падзяліцца сваімі думкамі наконт форм і метадаў работы клубаў, вызначыць кропкі сутыкнення як са сваімі калегамі, так і з рознымі ўстановамі і ведамствамі. Спадабаліся яму паказальныя выступленні юнакоў-дапрызыўнікаў. А вечарам гучалі «афганскія» песні ў выкананні тых, хто сам быў сведкай падзей Афганістане, хто не раз глядзеў у вочы смерці, хто яшчэ і цяпер усхопліваецца па начах ад жудасных сноў. Нельга было спакойна слухаць усхваляваныя выступленні воінаў-інтэрнацыяналістаў, маці загінуўшых салдат.

Лёня ўпершыню быў на такім зборы. Воіны-інтэрнацыяналісты горада нядаўна выбралі яго кіраўніком свайго клуба. Клуб яшчэ толькі пачынае дзейнічаць. Ёсць у яго свае планы, задумкі. Але ўсё гэта яшчэ наперадзе. Мікшта лічыць, што галоўнай задачай клуба павінна стаць падрыхтоўка бацькавы «універсітэты». Вячаслаў Іосіфавіч з дзяцінства прывучыў сына да заняткаў фізкультурай і спортам. Ужо ў шостым класе Лёня падымаў двухпудовую гіру, круціў «сонейка» на турнику, умеў добра плаваць. Пасля заканчэння сямі класаў яму прапанавалі паехаць у Магілёў у вышэйшую школу спартыўнага майстэрства. Правучыўся там год. Выканаў нарматывы кандыдата ў майстры спорту па цяжкай атлетыцы, класічнай барацьбе. Спорт стаў для яго неад'емнай часткай жыцця.

І ў час службы ў Афганістане разам з таварышамі наладжваў спаборніцтвы па перацягванню каната, па гіраваму спорту, кіданню гранаты, кросу.

У арміі Леанід авалодаў таксама і тэхнікай рукапашнага бою. Пасля службы атрымаў пасведчанне інструктара.

Не адразу Леня выбраў для сябе справу ў мірным жыцці. Спачатку ўладкаваўся на работу шаферам у тубсанаторый. Потым вырашыў пайсці ў аддзел унутраных спраў. Разумеў, што работа не з легкіх. Але кіравала ім абвостранае пачуццё справядлівасці. Выбар свій лічыць правільным. І вось ужо амаль чатыры гады ён, старшы сержант міліцыі Леанід Мікшта, працуе ў дзяржаўнай часці РАУС. У розных сітуацыях даводзілася бываць за гэты час. І заўседы Леня праяўляе вытрымку і прынцыповасць.

Ёсць ў яго ўзнагароды. Сярод іх самая дарагая – медаль «За баявыя заслугі». Не так даўно атрымаў медаль «70 год Узброеных Сіл СССР» і Ганаровую грамату ЦК ВЛКСМ.

Яму ўсяго 26. Як лічыць сам Леанід, наперадзе яшчэ многа цікавых і карысных спраў.

**З. Палулех**